УДК 793.22(476.1)

**С. А. Клімовіч,**
*загадчык Новінскага сельскага Дома культуры дзяржаўнай установы «Бярэзінскі раённы Цэнтр культуры», в. Новіны, Бярэзінскі раён, Мінская вобласць, Рэспубліка Беларусь*

# АДНАЎЛЕННЕ І ЗАХАВАННЕ АБРАДУ «ЦЯГНУЦЬ КАЛЯДУ НА ДУБА»

**Анатацыя**. *Разглядаецца старажытны абрад «Цягнуць Каляду на дуба», адноўлены ў 1998 г. у в. Новіны Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці. Захавальнікам абраду з'яўляецца народны сямейны гульнёва-абрадавы гурт «Радзіна», а пераемнікам – узорны фальклорны дзіцячы гурт «Валошкі» Новінскага сельскага Дома культуры. Аналізуецца пытанне выхавання дзяцей, падлеткаў і моладзі на традыцыях сваіх продкаў, мясцовым каларыце, назапашванне ўсяго таго, што неабходна для развіцця і ўзбагачэння светаўспрымання кожнага маленькага беларуса.*

**Ключавыя словы:** *цягнуць Каляду на дуба, абрад, гульнёва-абрадавы гурт, народныя традыцыі, вёска Новіны.*

**S. Klimovich,**
*the Head of the Novinsk Rural House of Culture of the State University "Berezin District Center of Culture", Noviny village, Beerezin District, Minsk Region, Republic of Belarus*

# RESTORATION AND PRESERVATION OF THE RITE "PULLING CHRISTMAS ON THE OAK TREE"

**Abstract.** *The ancient rite of "Pulling Christmas on the oak tree" was restored in 1998 in the village of Noviny, Berezinsky District, Minsk Region. The custodian of the rite is the folk family game-ritual group "Rodzyna", and the successor is the exemplary folklore children's group "Valoshki" of the Novinsk Rural House of Culture. Children, teenagers and young people are brought up on the traditions of their ancestors, local flavor, accumulate everything that is necessary for the development and enrichment of the worldview of every little Belarusian.*

**Key words:** *pulling Christmas on the oak tree, ritual, game-ritual band, backgammon traditions, Noviny village.*

У в. Новіны існуе з даўніх часоў у жывой традыцыі ўнікальны абрад провадаў Каляд, які адзначаецца 21 студзеня. Бярэзінцы паўсюль называлі яго «Цягнуць Каляду на дуба». Гэты абрад некалі быў

распаўсюджаны амаль на ўсёй тэрыторыі Бярэзінскага раёна і з’яўляецца этнічнай адметнасцю рэгіёна.

Упершыню абрад быў зафіксаваны загадчыкам кафедры рэжысуры абрадаў і свят БДУКМ, прафесарам, кандыдатам гістарычных навук П. А. Гудам у 1984 г. У час навуковай экспедыцыі ў Бярэзінскі раён Мінскай вобласці назіраў, як спраўлялі гэты абрад у в. Глухі Ток, напісаў артыкул у энцыклапедыю «Беларускі фальклор», энцыклапедыю «Культура Беларусі».

У 1998 г. абрад быў адноўлены Н. Д. Клімовіч, былым дырэктарам Новінскага СДК, якая збірала па крупіцах звесткі ад старэйшых носьбітаў фальклору ў сваёй і навакольных вёсках.

З таго часу абрад праводзіцца штогод. Захавальнікі абраду – народны сямейны гульнёва-абрадавы гурт «Радзіна», а пераемнікам з’яўляецца ўзорны фальклорны дзіцячы гурт «Валошкі».

У 2011 г. абрад «Цягнуць Каляду на дуба» ўключаны ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

Унікальнасць абраду ў тым, што ён адзіны на тэрыторыі Беларусі.

Кожнае каляндарнае свята, будучы сінкрэтычнай з’явай, складаецца з такіх элементаў, як настрой, святочныя адносіны, рэальна-ідэальныя ці ўмоўныя паводзіны, святочнае адзенне і інтэр’ер, святочныя стравы, святочны час.

Святы і абрады традыцыйна належаць да сферы духоўнай культуры, адна з галоўных адзнак якой – адсутнасць яе матэрыялізаваных вынікаў. Абрады, рытуалы існуюць толькі ў момант іх непасрэднага выканання, а ў перыяды паміж актамі выканання яны застаюцца ў свядомасці выканаўцаў.

Пэўная паўтаральнасць выканання абраду з аднолькавымі элементамі-тэкстамі абумоўлівае наяўнасць традыцыі. Традыцыя ў сваю чаргу вызначае сталасць функцыянавання форм культуры і, такім чынам, наяўнасць фактараў, што забяспечваюць яе аднаўленне. Існаванне такіх фактараў (стэрэатыпаў) звязана з перыядычным паўтарэннем пэўных сітуацый і патрэб [5].

Абрад «Цягнуць Каляду на дуба» адносіцца да катэгорыі элемента, пазначанага ў Канвенцыі як «Звычаі, абрады, святы, традыцыйныя цырымоніі, сістэмы сацыяльнай арганізацыі».

Традыцыйны рэгіянальны абрад провадаў Каляд 21 студзеня заключаецца ў тым, што самаарганізаваныя ўдзельнікі груп, якія калядавалі падчас свята, цягнуць на дуб саламянае пудзіла Каляды ў жаночай іпастасі (каб сядзела высока і садзейнічала багатаму ўраджаю ў новым сельскагаспадарчым годзе), кола або барану (каб буслы вяліся), а таксама абрадавую кашу-куццю (ахвяра душам продкаў), пасля чаго адбываецца традыцыйнае сумеснае частаванне-пагулянка ў складчыну ўдзельнікаў абраду з танцамі, песнямі, гульнямі, музыкай.

Абрад «Цягнуць Каляду на дуба» ў в. Новіны быў адроджаны ў канцы 1990-х гг., аднак не знікаў з памяці насельніцтва, захоўваў выразнае ўсведамленне сваёй значнасці. Ён з'яўляецца адкрыццём для навукоўцаў і аматараў традыцыйнай культуры. Па-першае, гэта адзіны ў Беларусі абрад, прысвечаны заканчэнню каляднага цыкла. Па-другое, ён спыняе спрэчкі наконт таго, ці існаваў персаніфікаваны міфалагічны вобраз Каляды. У Бярэзінскім раёне ён быў. Усе атрыбуты абраду разам з лялькай-Калядой і дзеянні з імі маюць глыбокі сімвалічны сэнс. Гэты абрад дадае шмат істотнага ў нашы веды пра светапогляд продкаў. Іх мысленне і выяўленне свайго бачання свету мовай сімвалаў проста фантастычнае для нашых сучаснікаў. Тэкст асноўнай абрадавай песні тлумачыць, для чаго цягнуць Каляду на дуба: для добрага ўраджаю ў новым сельскагаспадарчым годзе. Клопат пра будучы ўраджай, здароўе і шчасце ўсіх жыхароў в. Новіны і іншых вёсак Бярэзінскага раёна. Абрад і яго глыбокая сутнасць цікавыя тым, хто хоча ведаць свае карані: не толькі беларусам, але і ўсім славянам.

З кожным годам абрад «Цягнуць Каляду на дуба» набываў свае адметныя рысы. Ён праводзіўся часцей у выглядзе вячорак, на якіх прысутнічалі як дарослыя, так і дзеці. І гэта вельмі добра: вусны спосаб перадачы найбольш карысны, асабліва калі дзеці не проста чуюць пра яго, але прымаюць непасрэдны ўдзел.

Паколькі існавала шмат уяўленняў Каляды і ў розных вёсках было нешта сваё, нашай мэтай было распавесці менавіта пра ўласныя карані, захаваць і зберагчы традыцыі для нашых нашчадкаў.

Таму прыходзілася вельмі дасканала звяртацца да вывучэння семантыкі абрадавай дзеі, традыцыйных строяў, абрадавых страў, песеннай і музычнай афарбоўкі свята.

Журналістка Беларускага радыё Рэгіна Гамзовіч пра абрад «Цягнуць Каляду на дуба» даведалася ад выкладчыка тагачаснага Беларускага інстытута культуры П. А. Гуда. Ён даў Рэгіне Станіславаўне назвы вёсак, дзе фіксаваў звесткі пра гэту з'яву: хацеў, каб запісы былі зроблены на прафесійную гуказапісваючую тэхніку. У 1993 г. яна ўпершыню адправілася туды, каб расказаць слухачам праграмы «Спадчына» пра адзіны на Беларусі абрад на заканчэнне Каляд. Маршрут па вёсках раёна быў такі: Глухі Ток – Неганічы – Красны Бераг – Трасцянка – Святліца – Паплавы. У экспедыцыю карэспандэнт накіравалася ў канцы снежня, каб, сабраўшы інфармацыю, паехаць потым на Каляды і іх завяршэнне ў в. Новіны. (Экспедыцыі ладзіліся на працягу 1993–2004 гг.)

Справаздача Рэгіны Гамзовіч за 2011 г. як члена Каардынацыйнага савета па НКС Мінскай вобласці дапамагла Бярэзінскаму аддзелу культуры з афармленнем папкі «Абрад провадаў Каляд "Цягнуць Каляду на дуба"» ў в. Новіны Бярэзінскага раёна. У лістападзе 2011 г. абрад прыняты пад ахову дзяржавы, яму нададзены статус нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.

З 19 па 21 студзеня 2012 г. была здзейснена экспедыцыя ў Бярэзінскі раён сумесна з доктарам філалагічных навук, загадчыцай сектара этналінгвістыкі і фальклору Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, дацэнтам Таццянай Валодзінай, якая з'яўляецца экспертам гэтага абраду і прадстаўляла яго на Рэспубліканскай радзе, а таксама Таццянай Кухаронак – старшым навуковым супрацоўнікам ІМЭФ НАН, кандыдатам гістарычных навук. Мэтай экспедыцыі было:

1) наведаць вёскі і інфарматараў, якіх не паспелі запісаць на відэакамеру культработнікі раёна;

2) распытаць кваліфікавана з дапамогай спецыялістаў-навукоўцаў выяўленых жыхароў раёна, якія маюць звесткі пра абрад «Цягнуць Каляду на дуба»;

3) выявіць спявачак, ад якіх можна было б запісаць калядныя песні, паколькі абрад завяршае калядны цыкл;

4) паглядзець у жывой традыцыі абрад у в. Новіны, прыняты пад ахову дзяржавы як натуральны абрад, які бытуе ў гэтай вёсцы і які захоўвае на працягу 15 гадоў сямейны гурт «Радзіна», створаны Нінай Клімовіч загадчыцай мясцовага сельскага клуба.

Вынікі экспедыцыі паказалі, што сапраўды інфармацыю пра абрад можна запісаць практычна амаль у кожнай вёсцы раёна, хоць бы мінімальна, але пра яе ведаюць паўсюдна – што ў канцы Каляд збіраліся складчынай і адзначалі іх завяршэнне сумеснай трапезай.

Ёсць яшчэ даволі шмат інфарматараў, якія дадаюць усё новыя звесткі пра тое, хто, што і як «цягнуў на дуба». З чаго Таццяна Валодзіна зрабіла высновы і лічыць, што такі разнабой традыцый у кожнай вёсцы сведчыць пра аўтэнтычнасць абраду.

Увечары 20 студзеня дамаўляліся, у чыёй хаце будуць праводзіць Каляды (зараз у клубе), хто якія стравы гатуе, у колькі гадзін збіраюцца. Цяпер збіраюцца гадзін у 11–12, каб справіць абрад у абед – жыхары вёскі хочуць у ім паўдзельнічаць. Раней таксама прынароўліваліся да працоўнага часу – цягнулі Каляду раніцай да работы або пасля работы, а вечарам рабілі пагулянку ў складчыну. У які час спраўлялі даўней, калі былі аднаасобныя гаспадаркі, невядома. 21 студзеня раніцай збіраюцца і ўпрыгожваюць куль саломы ад зажыначнага (або дажыначнага) снапка, які заўсёды захоўваўся і прыносіўся ў хату перед першай каляднай куццёй і стаяў у чырвоным куце ўсё свята. З гэтага куля рабілі абрадавую ляльку, якую апраналі ў жаночае адзенне: спадніцу, кофту, фартух, хустку. Звараную ў чыгунку або гліняным гаршку куццю ставілі на сена ў рэшата, бралі старое кола ад воза або барану і везлі на саначках да дуба, які стаяў у полі або ў канцы сяла. Старое кола і саламяную ляльку, калі яны захаваліся з мінулага года, скідалі з дуба і падпальвалі, а на дуб усцягвалі новую ляльку ў жаночай іпастасі, кола або барану і куццю. Спявалі абрадавыя песні, вадзілі карагод вакол

дуба, а потым крыху частаваліся пад ім і ішлі да месца збору, дзе святкавалі заканчэнне каляднага цыкла свят. Танцавалі, спявалі, гулялі. Гэтак жа абрад спраўляюць і зараз.

У сучасны перыяд у жывой традыцыі абрад «Цягнуць Каляду на дуба» існуе ў в. Новіны на працягу 25 гадоў.

Праводзіцца абрад у абед, каб жыхары вёскі паспелі ў ім паўдзельнічаць – для іх гэта памяць продкаў, заканчэнне свята Каляд, якое пачынаецца традыцыйнай поснай сямейнай куццёй 6 студзеня, затым адзначаецца Шчодрай куццёй і карнавальнымі абыходамі ў ноч з 13 на 14 студзеня, а пасля – святам Вадохрышча, калі ходзяць па ваду да крыніц і акрапляюць асвячонай вадой хату і падворак. А 21 студзеня ўсе, хто спраўляў Каляды, збіраюцца ля клуба і апранаюць снапок абмалочанага жыта як жанчыну – фартушок, хустачка, вянок з кветак. Напярэдадні і зранку гатуюць калядныя багатыя стравы для святочнага пачастунку ў складчыну, зносяць усе стравы ў клуб. Наймаюць вазніцу з канём, які катае на санях па вёсцы дзяцей і дарослых. Гучаць музыка, песні, дзеці запрашаюць на абрад. А затым мужчыны ўпрагаюцца ў саначкі, на якія садзяць жанчыну з куццёй у гаршку ці чыгунку, яна трымае ў руках снапок-Каляду на коле. Праз усю вёску ідуць да дуба на ўскраіне, дзе сцягваюць леташні куль саломы, спальваюць яго, а на яго месца ўсцягваюць новы – разам з колам і з куццёй у гаршку. Пасля таго, як усцягнулі, вядуць кругавы карагод вакол дуба, частуюцца там жа і ідуць гуляць у клуб.

Людзі ведаюць, што так, як у іх вёсцы і раёне, нідзе не адбываюцца провады Каляд, таму вельмі гэтым ганарацца.

Носьбіты ўдзельнічаюць у захаванні і абавязкова праводзяць абрад «Цягнуць Каляду на дуба» кожны год у традыцыйны час у традыцыйным месцы з захаваннем усіх рэгіянальных і лакальных традыцый сваёй вёскі, пры ўдзеле дзяцей і моладзі.

Яны робяць усё, што ад іх залежыць, каб абрад захаваўся ў Новінах і адрадзіўся ў іншых вёсках – як добры прыклад выхавання дзяцей і моладзі ў народных традыцыях, сродак змагання з глабалізацыяй у галіне культуры, са знішчэннем этнічнай культуры пад уплывам фільмаў замежнай вытворчасці, якія запаланілі тэлеэфір і Інтэрнэт, дрэнна ўздзейнічаюць на падрастаючае пакаленне.

Абрад «Цягнуць Каляду на дуба» не мае ўзроставых і сацыяльных абмежаванняў. Ён аднолькава цікавы як дзецям, так і дарослым, а таксама не абыходзіць бокам гэту падзею і моладзь.

Здаецца, што зацікавіць дзяцей беларускім фальклорам, беларускай мовай, спевамі, музыкай у наш час інавацый вельмі цяжка, але гэта магчыма. Менавіта ў час абрадаў і свят, якія праводзяцца на базе Новінскага сельскага Дома культуры, а гэта: «Калядныя шчадроўкі», Масленіца, «Гуканне вясны», «Саракі», «Вербніца», «Вялікдзень», траецкі абрад «Ваджэнне куста», «Зажынкі», «Дажынкі», абрады радзіннага і

вясельнага цыкла, дзеці праводзяць свой вольны час не ў Інтэрнэце, а менавіта ў жыцці. Яны апранаюць святочныя строі, танчаць, спяваюць, удзельнічаюць у гульнях, частуюцца беларускімі традыцыйнымі стравамі.

Выхаванне і веданне народных традыцый роднай вёскі – важная прыкмета культурнага чалавека. Прывіваць гэту культуру трэба з маленства.

Вывучэнне, асэнсаванне і ўкараненне ў сучасныя святы рэгіянальных і мясцовых традыцый з’яўляецца актуальным і сацыяльна значным.

Тое, што абраду нададзены статус гісторыка-культурнай нематэрыяльнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь, з’яўляецца значным фактарам захавання лакальнай культурнай спецыфікі, кансалідацыі і жыццяздольнасці вясковай супольнасці, бо ў яго ёсць захавальнікі і пераемнікі.

Штогод папка папаўняецца новымі матэрыяламі, фотаздымкамі, відэазапісамі. У Гасцявую кнігу наведвальнікі запісваюць свае ўражанні ад убачанага.

21 студзеня 2015 г. абрад «Цягнуць Каляду на дуба» здымалі тэлеканалы МИР, «Беларусь-1», СТВ, а таксама фотакарэспандэнты Аляксей Сталяроў і Васіль Фядосенка.

У 2017 г. захавальнікі абраду папоўнілі свой гардэроб кажушкамі і жылеткамі.

У 2018 г. народны сямейны гульнёва-абрадавы гурт «Радзіна» і ўзорны фальклорны гурт «Валошкі» ў Палацы Рэспублікі прымалі ўдзел у канцэртнай праграме, прысвечанай 80-годдзю Мінскай вобласці «Міншчына – ты сэрца Беларусі» (з фрагментам зімовага абраду «Развітанне з Калядамі»).

З кожным годам абрад прываблівае ўсіх сваім непаўторным каляд-ным каларытам, магчымасцю дакрануцца да мінулага.

У 2019 г. у СДК завіталі госці з тэлепраекта «Жывая культура» (тэлеканал «Беларусь-3»), каб пабачыць на свае вочы, як ідзе падрыхтоўка да абраду, як яго праводзяць і чым ён увогуле цікавы не толькі жыхарам Бярэзіншчыны, але і гасцям з усіх куточкаў нашай Радзімы. Тэлеперадача была прадстаўлена гледачам 15 лютага 2019 г. (https://www.youtube.com/watch?v=c7tFQ1oEDXI).

У 2020 г. абрад быў яшчэ больш цікавым, таму што свае карэктывы ўнесла надвор’е: 21 студзеня не было снега і ўсім вельмі хацелася паглядзець, як жа Каляду будуць цягнуць. Але і на гэты выпадак, як кажуць, у добрага гаспадара ёсць акрамя саней колы і воз. І таму бабулю разам з Калядой пасадзілі на конны воз і зацягнулі на поле да дуба. Святочная працэсія накіроўвалася да дуба пешшу з абрадавай музыкай, песнямі, прыпеўкамі. І зноў было вельмі шмат журналістаў і карэспандэнтаў, фатографаў, жыхароў Бярэзінскага раёна і гасцей. А таксама ўпершыню не проста прысутнічаў, а прымаў непасрэдны ўдзел у абрадзе дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання І. У. Лаўрыненка з жонкай.

Усё большую папулярнасць абрад набывае цераз сродкі масавай інфармацыі, асабліва Інтэрнэт. Не паспееш Каляду зацягнуць на дуба, а знаёмыя ўжо тэлефануюць, што яны хоць і не змаглі прыехаць дапамагчы правесці абрад, але пабачыўшы, як гэта адбываецца, нібыта прысутнічалі і разам святкавалі.

У 2021 г. з самай раніцы ў Новінскім СДК панаваў ажыятаж, таму што прыехалі госці з «ЭтнаТрадыцыі», якія вельмі хацелі запісаць сюжэт (без умяшання ў сам абрад), а пасля зрабіць невялікі фільм для анлайн-трансляцыі ў сацыяльных сетках. Пасля яны былі здзіўлены, што абрад прайшоў так, як ім і расказвалі, калі яны бралі інтэрв'ю. Былі выкананы ўсе традыцыі і звычаі: прабачэнне грахоў, падрыхтоўка каляднага стала і г. д.

Для тых гасцей, якія па розных прычынах не змаглі прыехаць да нас дапамагчы зацягнуць Каляду на дуба, падзеі былі асветлены ў розных інфармацыйных сродках, а таксама ў відэафільме (https://www.youtube.com/watch?v=7ykg7TTV1Qw АБРАД ЦЯГНУЦЬ КАЛЯДУ НА ДУБА / Анлайн-Каляды з «Этна Традыцыяй» на youtube.com).

У мінулым годзе завіталі да нас дзеці з гімназіі № 18 г. Мінска разам з бацькамі.

У 2022 г. у госці завіталі Д. В. Скварчэўскі, кандыдат гістарычных навук БДУ і аматары традыцыйнай беларускай культуры Д. В. Філіпчык, М. І. Знак.

Такім чынам, вельмі важна тое, што абрад выклікае вялікую цікавасць з боку малодшага пакалення, дзяцей і моладзі, якія актыўна прымаюць удзел у дзеях. А таксама варта адзначыць, што менавіта абрадавы святочны настрой сёння вызначае вартасць абраду.

На працягу ўсяго часу асноўным захавальнікам абраду з'яўляецца народны сямейны гульнёва-абрадавы гурт «Радзіна», а пераемнікам – узорны фальклорны дзіцячы гурт «Валошкі». Гэта дае падставу спадзявацца, што яшчэ доўгі час абрад будзе існаваць. Як і раней, захавальнікі робяць усё, каб не губляліся карані нашай мінуўшчыны – абрад «Цягнуць Каляду на дуба»: калядныя стравы, святочныя строі, песні і танцы, якія бытавалі на Бярэзіншчыне, з'яўляюцца сапраўдным хараством для гасцей і ўсіх прысутных.

Дзеці і моладзь, выхаваныя на мясцовых традыцыях уласным удзелам у іх, будуць душой прывязаныя да роднага кута, змогуць усведамляць сябе адной этнічнай супольнасцю.

Змястоўны адпачынак летам і зімой з цікавымі забавамі, удзелам у абрадах падабаецца людзям рознага ўзросту.

Многія знаходзяць звесткі пра абрад у Інтэрнэце і ў сродках масавай інфармацыі або даведваюцца ад сваякоў, хто можа, стараецца прыехаць і паўдзельнічаць у ім.

Магчыма, сувязь сучаснай вёскі з горадам праз традыцыйныя абрады, святы і здаровы адпачынак акажуцца ўзаемакарыснымі. Нехта з

прадпрымальных людзей захоча вярнуцца ў вёску назусім, хтосьці прыедзе адпачыць, ацэніць прыгажосць акаляючай прыроды і чысціню вады, здаровае харчаванне натуральнымі прадуктамі – і гэта стане дадатковым прыбыткам для сельскіх жыхароў у Бярэзінскім раёне.

Хочацца, каб у кожным рэгіёне, дзе ёсць традыцыйныя абрады ці звычаі, каб іх адрадзілі, аднавілі і абавязкова захавалі, бо гэта трэба нам і абавязкова нашым дзецям. Гэта наша з вамі спадчына.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

*1.* Анталогія беларускай народнай песні / уклад., прадмова і камент. Г. Цітовіча. – 2-е выд., дап. – Мінск : Беларусь, 1975. – 616 с.

*2.* Беларускія летапісы і хронікі ; пер. са старажытнарус., старабеларус. і пол. / уклад. У. Арлова ; прадм. В. Чамярыцкага. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1997. – 432 с.

*3.* Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / уклад., класіф., сістэматыз. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага ; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 429 с. – (Беларуская народная творчасць).

*4. Цітоў, В. С.* Этнаграфія Беларусі : энцыкл. / В. С. Цітоў. – Мінск, 1989. – С. 525–526.

*5. Чистов, К. В.* Традиция и вариативность / К. В. Чистов // Советская этнография. – 1983. – № 2. – С. 15.

УДК 677.541.3:745.5(476.4)

**И. Г. Кухтина,**
*директор государственного учреждения образования «Детская школа художественных ремесел и искусств г. Быхова», народный мастер соломоплетения, член Белорусского союза мастеров народного творчества, г. Быхов, Республика Беларусь*

## ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ПО СОХРАНЕНИЮ ЭЛЕМЕНТА НЕМАТЕРИАЛЬНОГО НАСЛЕДИЯ «ТРАДИЦИЯ ИЗГОТОВЛЕНИЯ СОЛОМЕННОГО ПАУКА В БЫХОВСКОМ РАЙОНЕ»

**Аннотация.** *В статье представлен опыт государственного учреждения образования «Детская школа художественных ремесел и искусств г. Быхова» и результаты разноплановой деятельности по изучению и сохранению нематериального культурного наследия «Традиция изготовления соломенного паука в Быховском районе». Подчеркивается важность присоединения к традиции молодого поколения, придающего новую жизнь оригинальному, но практически забытому*